

2550. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан.*

тыйскага фронту. У 1962 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

2551. РАДЗІМА КРАСНІКА Івана Міхайлавіча (гіст.).

Герой Савецкага Саюза І. М. Краснік нарадзіўся 30.7.1906 г. ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1930 г. У Чырвонай Арміі з 1928 г. Скончыў Мінскае артылерыйскае вучылішча (1932 г.). У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на Заходнім, Калінінскім, Ленінградскім і 1-м Беларускім франтах. У час прарыву абароны праціўніка ў раёне Візенаў — Брыскаў самаходны артылерыйскі полк пад камандаваннем падпалкоўніка І. М. Красніка захапіў участак шашы Франкфурт-на-Одэры — Берлін, адбіў 12 контратак праціўніка, знішчыў 24 танкі і самаходныя гарматы, 187 гармат, мінамётаў і кулямётаў, 24 дзоты і больш за 900 варожых салдат і афіцэраў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 31.5.1945 г. Да 1956 г. палкоўнік І. М. Краснік служыў у Савецкай Арміі. Памёр 18.2.1957 г. Пахаваны ў г. Барысаў Мінскай вобласці.

Літ.: Навечно в сердце народном.— 3 изд.— Мн., 1984. *В. Б. Караткевіч.*

в. Кажары, Пачаевіцкі сельсавет

2552. КАМЕННЫЯ КРЫЖЫ (археал.) На могілках, справа ад дарогі ў в Кажары. 18 крыжоў, побач — вялікая колькасць каменных пліт, высечаных з мясцовага шэрага граніту. Памеры крыжоў: вышыня 0,7—1,5 м, шырыня 0,6—0,9 м, таўшчыня 0,15—0,25 м. Адносяцца да 13—16 стагоддзяў. На асобных крыжах — надпісы на стараславянскай мове.

с. Кашчына, Новазаранскі сельсавет


2553. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі, каля школы. Пахаваны 5 воінаў і 31 партызан 1-й Беларускай партызанскай брыгады (другога складу), якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. У 1964 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

в. Коцевічы, Іванскі сельсавет

2554. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 19 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—44 гг. Сярод пахаваных — воіны 357-й стралковай дывізіі 43-й арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту, што загінулі ў чэрвені 1944 г. ў баях за вызваленне Чашнікаў. У 1959 г. на магіле пастаўлены абеліск.

2555. ПОМНІК ВОІНАМ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ 1812 г. (гіст.). На паўднёвай ускраіне вёскі, справа ад дарогі на Чашнікі.

У Айчынную вайну 1812 г. пасля бітвы (6.10) каля Таруціна пачалося адступленне напалеонаўскіх войск. 8.10.1812 г. быў вызвалены Полацк. Французскі корпус Г. Сен-Сіра, які праследаваўся корпусам генерала П. Х. Вітгенштэйна, адступіў у напрамку Ушачы — Лепель — Чашнікі, каля в. Коцевічы ён злучыўся з корпусам маршала К. Віктора, які падышоў з-пад Смаленска. 19 кастрычніка войскі П. Х. Вітгенштэйна атакавалі французаў. Упартая бітва за Чашнікі вялася на працягу дня. Праціўнік быў разгромлены і адступіў на Сянно.



2555. *Помнік воінам Айчыннай вайны 1812 г.*

Армія П. Х. Вітгенштэйна вызваліла Чашнікі, выйшла на злучэнне з арміяй адмірала П. В. Чычагова і перарэзала шлях адступаючай напалеонаўскай арміі.

У 1962 г. ў памяць аб гэтых падзеях пастаўлена стэла.

Літ.: Корнейчик Е. И. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 года.— Мн., 1962. *В. Б. Караткевіч.*

в. Красналукі, цэнтр сельсавета

2556. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). Каля клуба. Пахаваны 38 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1964 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

2557. МАГІЛА БУЛАХАВА Фядота Паўлавіча (гіст.). Каля клуба, у сквера. Камісар 1-га партызанскага атрада 1-й Беларускай партызанскай брыгады (другога складу) Ф. П. Булахаў загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх карнікаў 4.4.1944 г. У 1964 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Лазукі, Кругліцкі сельсавет

2558. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). На заходняй ускраіне вёскі, на ўзгорку. Пахаваны 62 воіны і партызаны, а таксама партызанскія сем'і, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1962 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

в. Лукомль, цэнтр сельсавета

2559. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 31 воін і партызан. Сярод іх — воіны 215-й стралковай дывізіі 5-й арміі 3-га Беларускага фронту, якія загінулі 27.6.1944 г. пры вызваленні Лукомля, і партызаны брыгад Сенненскай (загінулі пры разгроме нямецкага гарнізона ў верасні 1943 г.) і Чашніцкай (загінулі ў баях за вёску ў верасні 1943 г. і ў чэрвені 1944 г.).

У 1962 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

2560. ГАРАДЗІШЧА, СЕЛІШЧЫ, КУРГАН, КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). Комплекс археалагічных помнікаў даследавалі ў 1886 г. Е. Р. Раманаў, у 1930 г. А. Дз. Каваленя, у 1956 г. Л. В. Аляксееў, у 1966—69, 1971, 1973—74 гг. Г. В. Штыхаў.

2560а. Гарадзішча. У вёсцы, на правым беразе р. Лукомка, на пагорку вышынёй 15—20 м. Пляцоўка памерам 63×36 м. Культурны пласт у цэнтры пляцоўкі 2,2 м, каля паўночнага краю больш за 5 м. Пры раскопках у 1966—69, 1971, 1973—74 гг. даследавана 704 м² плошчы. Выяўлены рэшткі некалькіх археалагічных культур, якія храналагічна змяняюць адна адну: днепра-дзвінская (рубеж